І робяць!

Юнгіянцы лічаць, што дзейнічаць трэба было б інакш: неабходна асіміляваць свой цень, а для пачатку хаця б убачыць яго. Мана-асоба, “сябар Божы”, які прысвойвае сабе боскія паўнамоцтвы – права судзіць і помсціць, –не разумее ступені сваёй інфляцыі (і яе вынікаў). “Няўжо думаеш ты, чалавек, што пазбегнеш суда Боскага, асуджаючы тых, хто робіць такія *справы*, і (сам) робячы тое ж самае?” (Рым. 2:3).

У індывідуальнай псіхіцы Я прэтэндуе на ролю цэнтра асобы, хаця такім не з’яўляецца. Цэнтр – тое, што рэлігійны чалавек называе Богам. У калектыўнай псіхіцы на ролю цэнтра прэтэндуе дзяржава.

Можа быць, над дзяржаўнымі інтарэсамі павінны стаяць агульначалавечыя? Паводле слоў М.Фёдарава, кожны народ “ёсць толькі частка цэлага роду чалавечага, частка, якая будзе бясплодная без аб’яднання з усімі іншымі народамі”.

---

1. *Здравомыслов А.Г.* Социология конфликта: Россия на путях преодоления кризиса: Учеб. пособие для студентов высших учебных заведений. – 2-е изд., доп. – М.: Аспект Пресс, 1995. – 317 с.

2. *Подзигун И.М.* Глобализация как реальность и проблема // Философские науки. – 2003. – № 1. – С. 5–16.

3. *Самуэлс Э.* Юнг и постъюнгианцы. Курс юнгианского психоанализа / Пер. с англ. – М.: ЧеРо, 1997. – 416 с.: ил.

4. *Эдингер Э.Ф.* Эго и архетип / Пер. с англ.– М.: ООО “ПентаГрафик”, 2000. – 264 с.

5. *Юнг К.Г.* Архетип и символ / Сост. и вступ.ст. А.М.Руткевича. – М.: Ренессанс, 1991. – 304 с.

6. *Юнг К.Г.* Современность и будущее. – Мн.: Университетское, 1992. – 62 с.

*Л.А.Старцава*

## ВЫРАШЭННЕ ПРАБЛЕМЫ ЖАНОЧАЙ АДУКАЦЫІ Ў XV – ПАЧАТКУ XVIII ст.

Эпоха Адраджэння з’яўляецца пераломнай у гісторыі еўрапейскай філасофскай думкі. Зменам светапогляду ў гэты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перыяд спрыялі значныя змены ў грамадстве, у яго сацыяльным і культурным жыцці. Менавіта ў гэты перыяд фарміравалася навуковая думка, якая не была звязана з рэлігійнай праблематыкай, што панавала ў сярэднявеччы. Сярод пытанняў, якія хвалявалі гуманістаў, значнае месца займала жаночая адукацыя, яна разглядалася як неабходная частка агульнай культуры Адраджэння.

Адной з першых жанчын, якую хвалявала праблема жаночай адукацыі, была Крысціна Пізанская, асветніца і літаратар XV ст. Значна пазней, у XXст., Сімона дэ Бавуар у кнізе "Другі пол" пісала пра яе дзейнасць, што "дзеля абароны свайго полу яна ўзяла пяро", і гэта была непераможна цяжкая справа для жанчыны. Яна заўважыла, што значна пазней, у XVII ст., пісьменніца лэдзі Вінхілсі сутыкнулася з вялікімі перашкодамі на творчым шляху.

У сваёй знакамітай кнізе "Жаночы горад" Крысціна Пізанская пераасэнсавала традыцыйнае стаўленне да жаночай адукацыі. Асветніца прыводзіць мноства прыкладаў з гісторыі, калі жанчыны былі выдатнымі дзеючымі асобамі. На думку пісьменніцы, нападкі на жанчын абумоўлены тым, што яны абмежаваны ў сферы сацыяльнай дзейнасці. Роля жанчыны ў найбольш значных сферах грамадскай дзейнасці была мінімізаванай, таму часцей за ўсё менавіта жанчына была мішэнню для "маралізуючай крытыкі" як для царкоўнікаў, так і для мірскіх асоб.

Думкі аб жаночай ролі ў грамадскім жыцці, ды яшчэ выказаныя жанчынай, былі неверагодным крокам для жанчыны ў XVст. Трэба заўважыць, што Крысціна з'яўлялася прыдворнай дамай Марыі Анжуйскай. Нягледзячы на высокі ўласны сацыяльны статус, асветніца выйшла за свае даволі жорсткія "сацыяльныя межы" і выступіла ў якасці палітычнага суб'екта. Яна аказвала значны ўплыў на палітычнае жыццё краіны, а яе кніга "Жаночы горад" цікавіць і сучасных даследчыкаў. Крысціне Пізанскай належыць думка аб тым, што адной з асноўных перашкод на шляху інтэлектуальнага росту з'яўляецца забарона прымаць жанчын у адукацыйныя ўстановы. Асветніца збірала трактаты праціўнікаў і прыхільнікаў жаночай адукацыі і аднойчы па-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дарыла гэтую калекцыю сваёй апякунцы Елізавеце Баварскай.

Дзейнасць Крысціны Пізанскай можна лічыць “марным лямантам у пустыні”, але яна гэтым самым падтрымала жанчын, якія абралі літаратуру ў якасці прафесійнага занятку значна пазней, у XVII–XVIII стст. Сярод твораў пісьменніцы вылучаецца трактат “Аб палітычным ладзе” (1418), дзе яна разглядае магчымасці сацыяльнага развіцця грамадства, якое не выключае “жаночае пытанне” з шэрага праблем.

У эпоху Адраджэння мноства прыхільнікаў жаночай адукацыі сустрэлі амаль неадольнае супраціўленне кансерватараў, якія лічылі, што адукацыя жанчын з’яўляецца немагчымым, дарэмным і недальнабачным крокам. Адукацыя дзяўчынак сярэднявечча зводзілася да вывучэння рэлігійных ведаў і кіравання хатняй гаспадаркай, бо лічылася, што ніякія веды “патрэбны не былі”. У дваранскім асяроддзі хлопчыкі вывучалі класічныя навукі на лацінскай мове ва універсітэтах. У далейшым гэта дазваляла ім пабудаваць духоўную ці грамадзянскую кар’еру.

У 1523 г. Жан-Луі Віў надрукаваў трактат “Інстытут хрысціянскіх жанчын”, які быў прысвечаны жаночай адукацыі; ён добра разумеў, што трэба распрацоўваць гэтае пытанне, і спадзяваўся, што знойдзе прыхільнікаў. Аднак паспрабаваўшы нейкім чынам вырашыць гэтую праблему, ён абумовіў “межы дазволу” для адукацыі дзяўчынак. Напрыклад, асноўным жаночым заняткам заставалася хатняя гаспадарка, але ж гаспадыня, на яго думку, абавязкова павінна была чытаць і пісаць; лацінскую мову і для высакародных дам трэба было выкладаць з вялікай асцярожнасцю. Томас Мор, аўтар знакамітай “Утопіі”, быў упэўнены, што здольнасці жанчын не ўступаюць мужчынскім, і раіў больш старанна і руплiва займацца адукацыяй жанчын. Эразм Ратэрдамскі быў згодны з Вівам у гэтым пытанні. У сваім трактаце “Cologia” ён падтрымаў думку аб неабходнасці жаночай адукацыі, бо адукаваныя людзі заўсёды зразумеюць адзін аднаго. Трактат “Аб высакароднасці і дасканаласці жанчын” Карнеліуса Агрыпы быў шырокавядомы ў тыя часы; на думку аўтара, абмежаванні жаночай дзейнасці былі звязаны ў тым ліку і з сацыяльнымі звычаямі, традыцыяй, якія падтрымліваюцца

менавіта праз існуючую адукацыю і выхаванне. Трактаты, прысвечаныя гэтай праблеме, пісалі Мадэста дзі Поцут дзі Форзі і Мары Ленсар дэ Гурнэ, але, на думку Сімоны дэ Бавуар, жанчыны ў XVIст. у большасці сваёй заставаліся малаадукаванымі.

Адной з самых адукаваных жанчын у Еўропе XVIIст. лічыцца Елізавета I, каралева Англіі, якая ведала французскую, іспанскую, італьянскую і грэчаскую мовы. Яе двор з'яўляўся цэнтрам адукацыі для высакародных жанчын, і гісторыкі назвалі гады ўлады Елізаветы I "залатой эпохай адукаваных лэдзі".

У XVIIст. сітуацыя пачала мяняцца. Было прызнана, што "калі б жанчыны атрымлівалі ва універсітэтах адукацыю, падобную да мужчынскай, то маглі б быць дактарамі тэалогіі, медыцыны і права. Прыродны жаночы талент патрэбна развіваць з дапамогай адукацыі". Найбольш рашуча гэтую думку падтрымаў Пулен дэ ла Бар, які ў 1673 г. заклікаў прызнаць раўназначнасць правоў мужчын і жанчын. Ён адзначаў, што ў "жанчыны ніколі не было роўных магчымасцей – ні што датычыцца волі, ні ў сферы адукацыі". Марыя Астэл у 1694г. пашырыла межы гэтай праблемы і заўважыла, што прычыны большасці сацыяльных і грамадскіх праблем застаюцца нявырашанымі з-за грэбавання "жаночым пытаннем".

Дзяўчынкі з высакародных сем'яў перш за ўсё вучыліся танцам, спевам, рукадзеллю і хатняй гаспадарцы, бо "гэтыя веды маглі ім спатрэбіцца для пошуку спадарожніка жыцця". Напрыклад, графіня Нью-Касл пісала, што нікога не цікавілі яе поспехі на ўроках, а "маці хвалявала толькі тое, каб дзяўчына была сарамлівай, сумленнай і дабрадзейнай". Папулярны ў XVII ст. англійскі пісьменнік Брэйвейт сцвярджаў, што дзяўчынкі павінны толькі ведаць Біблію, таму што жанчына заслугоўвае павагі не з-за ведаў, а з-за належных паводзін "добрай гаспадыні". Вельмі адукаваныя жанчыны, на яго думку, рызыкуюць "зацямненнем і стратай свядомасці". На думку С.Мендэльсон, такі стан "незацікаўленасці", звязаны з адукацыяй жанчын, спрыяў іх выключэнню з палітычнага і культурнага жыцця грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У два апошнія дзесяцігоддзі XVIIст. французскія асветнікі, напрыклад Клод Флеры, прапанавалі практычнае вырашэнне гэтага пытання; былі створаны першыя адукацыйныя праграмы для жанчын, але з іх выключаліся такія прадметы, як класічныя мовы, рыторыка і філасофія. Адной з умоў павелічэння цікавасці да адукацыі жанчын даследчыкі лічаць змену сацыяльнай структуры грамадства ў выніку шматлікіх войнаў: вялікая колькасць удоў засталася без сродкаў да існавання, і ім было патрэбна неяк дапамагчы. Для вядзення хатняй гаспадаркі і для падтрымкі дзіцячай адукацыі жанчыны павінны былі валодаць пачатковымі ведамі, бо ў неадукаванай маці дзеці заставаліся таксама неадукаванымі. Клод Флеры, напрыклад, лічыў, што жаночыя розум і далікатнасць дазваляюць хаця б неяк кампенсаваць недахопы ў адукацыі; жанчынам неабходна быць адукаванымі і для падтрымкі сваёй рэпутацыі. Сярод найгалоўнейшых дысцыплін для вывучэння ён лічыў асновы эканомікі (але толькі дамашняй) і права. Цікава, але ён заўважыў, што калі б жанчыны вывучалі больш прадметаў, то гэта пагражала б празмернай жаночай ганарыстасцю. Мадам Фенелон лічыла, што дзяўчынкам неабходна вывучаць літаратуру, гісторыю, лацінскую мову, музыку і маляванне. Ёй належыць думка аб тым, што жанчына павінна мець такую адукацыю, якая спатрэбіцца і ў сямейным жыцці, і ў манастыры, калі жанчына вырашыць прысвяціць сябе Богу.

Адна з французскіх прыдворных дам, мадэмуазель дэ Ментэнон, склала адукацыйную праграму для манастыра Сен-Курэ. Гэтая ўстанова адукацыі была створана ў 1686 г. для дзяўчынак з высакародных, але збяднелых сямей; тут, акрамя адукацыйных дысцыплін, іх вучылі “мірыцца со сваёй доляй”. Выхаванкі гэтага манастыра пазней станавіліся выхавальніцамі ў шляхецкіх (дваранскіх) сем’ях, дзе падтрымлівалася неабходная і абавязковая для таго часу “аўра высакароднасці”.

Некаторыя жанчыны атрымлівалі добрую хатнюю адукацыю дзякуючы сваім бацькам, якія разумелі жыццёвую неабходнасць адукацыі для дзяцей, нягледзячы на тое, хлопчык гэта ці дзяўчынка. Акрамя прыкладу Крысціны Пізанскай, можна прывесці прыклад Анны Марыі ван Шурман, якая бы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ла вядомай еўрапейскай жанчынай-навукоўцам у XVII ст. Часцей за ўсё чытанне кніг мела асноўнае значэнне для самаадукацыі жанчын, а дамашнія бібліятэкі ў той час былі дастаткова распаўсюджаны. Цікавую гісторыю пра дамашняе чытанне можна знайсці ў кнізе Годфрэя "Дамашняе жыццё ў эпоху Сцюартаў". Высакародная англійская дама Люсі Хатчысон пісала аб тым, што найбольш цікавым заняткам для яе з'яўляецца чытанне. Другая дзяўчына, дачка лорда Тэнфільда, Элізабет, самастойна, без дапамогі настаўнікаў, вывучыла іспанскую, італьянскую і лацінскую мовы, а таксама зрабіла пераклад твораў Сенекі. Яе маці, пачуўшы пра "дрэнныя" заняткі дачкі, пачала хаваць свечы. Потым, калі Элізабет выйшла замуж, яе слугі патрабавалі, каб маладая гаспадыня вярнула ім сто фунтаў стэрлінгаў, бо на гэтыя грошы яны былі вымушаны купляць свечы для яе "чытання".

Джон Лок, Джанатан Свіфт пісалі аб тым, што непавага да праблемы жаночай адукацыі ёсць непавага да будучыні грамадства.

Змены адносна "жаночага пытання" ў XVII – пачатку XVIII ст. можна звязаць з зараджэннем капіталістычных адносін, калі свет пашыраў і змяняў свае межы.

Жаночая дзейнасць па перабудове сацыякультурнага жыцця ў XVIII ст. набывае асаблівасці, звязаныя з фарміраваннем навукі новага часу. Жанчыны праяўляюць свае здольнасці галоўным чынам у інтэлектуальнай сферы, і, як піша Сімона дэ Бавуар, "дзякуючы размовам, кнігам, заняткам з прыватнымі настаўнікамі яны дасягаюць іншы раз больш значных поспехаў, чым іх мужы". Папулярнымі становяцца літаратурныя салоны, якія з'яўляліся адначасова і неафіцыйнымі ўстановамі адукацыі, і жаночай прасторай, у якой "паўставалі пытанні аб інтэлектуальнай роўнасці паміж жанчынамі і мужчынамі, аб важным прызначэнні культуры, аб міры і гармоніі як аб грамадскіх каштоўнасцях". На думку даследчыкаў, салоны былі той прасторай, дзе жанчыны маглі знаёміцца з вядучымі ідэямі свайго часу, знайсці слухачоў, якія цікавіліся і падтрымлівалі жаночую творчую музычную і літаратурную дзейнасць. Тыя жанчыны, якія цікавіліся навукамі больш, чым балямі, з 80-х гг. пачалі звацца "сінімі панчохамі". Гэта звязана з дзейнасцю салона лэдзі Мантэгю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Найбольш знакамітым яе госцем быў вучоны Б.Стэлінгфлінт, які, нягледзячы на моду, заўсёды быў апрануты ў чорны касцюм і сінія панчохі. Байран напісаў пра гэта сатырычны твор. Пасля мянушку "сінія панчохі" атрымалі ўсе, хто цікавіўся навукай ці меў літаратурныя здольнасці.

"Жаночая гісторыя" чакае сваіх даследчыкаў. Гендэрная праблематыка паступова пачынае пранікаць у навуковую сферу, але распрацоўка праблем, звязаных з гісторыяй жаночай адукацыі, жаночай творчасці, ускладняецца невялікай колькасцю літаратуры, прысвечанай гэтаму пытанню.

---

1. *Бовуар де С.* Второй пол. – СПб., 1997. – С. 144.

2. *The selected* writings of Christine de Pizan. Ed. by Renate Blumenfeld –Kosinski. – New York, 1996.

3. *Sonnet M.* A Daughter to Educate // A history of women. – London, 1997.

4. *Stone L.* The Family, Sex and Marriage in England. 1500–1800. – London, 1977. – P. 203.

5. *Успенская В.И.* Идея прав женщин в истории европейской социальной мысли // Гендерный калейдоскоп: Курс лекций. – М., 2001.

6. *Godfrey E.* Home Life under the Stuarts. 1603–1649. – London, 1903. – P. 104.

7. *Короткова М. В.* Культура повседневности: история костюма. – М., 2002. – С. 170.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ